Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ Н. У. Карчэўская
«___» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная)*

2018

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
*Т. В. Карнажыцкая,* дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*А. А. Макарава*, прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*С. Б. Майсяйчук*, прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*І. Л. Смарговіч*, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 01.03.2017);
*саветам* факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 29.03.2017);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 19.10.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. А. Макарава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Удасканаленне сістэмы адукацыі, уключаючы вышэйшую школу, прадугледжвае фарміраванне новых падыходаў, накіраваных на набліжэнне падрыхтоўкі спецыялістаў да еўрапейскіх і сусветных стандартаў. Сярод падыходаў, накіраваных на паляпшэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, важнае месца займае антрапакультуралагічная парадыгма і сацыялагічны падыход. Гэтая акалічнасць асаблівае значэнне мае для студэнтаў універсітэта культуры і мастацтваў. Выпускнікі ўніверсітэта будуць працаваць на ніве культуры, дзе вельмі значнае месца адыгрывае чалавекаўтвараючая сутнасць культуры, найвышэйшае назначэнне якой – фарміраванне і развіццё асобы, яе духоўнага свету, жыццёвых пазіцый, сэнсажыццёвых установак у развіцці грамадства і адначасова працэс стварэння каштоўнасцей культуры.

*Мэтай* дзяржаўнага экзамену па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная) з’яўляецца высвятленне сфарміраванасці ў студэнтаў трывалых навыкаў і ўменняў, якія неабходны для паспяховага вырашэння навукова-даследчых, праектных і кіраўніцкіх задач у сферы культуры.

Прыкладная культуралогія як галіна культуралагічных ведаў раскрывае метадалагічныя асновы, заканамернасці, прынцыпы, сродкі, метады і формы прыцягнення чалавека ў свет культуры, вызначае механізмы стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя, якая абгрунтоўвае тэхналогію забеспячэння ўмоў для рэалізацыі духоўна-эўрыстычных і мастацка-творчых патэнцый людзей, праявы іх сацыяльна-культурнай актыўнасці, а таксама вывучае, плануе і распрацоўвае методыку мэтанакіраванага прагназавання і кіравання сацыякультурнымі працэсамі ў рамках дзяржаўнай культурнай палітыкі.

У адпаведнасці з дзяржаўным адукацыйным стандартам Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-21 04 01-2013 па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная) выпускнікі павінны набыць сацыяльна-прафесійную кампетэнтнасць у спа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лучэнні з акадэмічнымі (АК), сацыяльна-асобаснымі (САК) і прафесійнымі (ПК) кампетэнцыямі для рашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці:

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў.

ПК-5. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-7. Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне культуралогіі.

ПК-9. Арганізоўваць сваю працу на навуковай аснове, валодаць камп'ютарнымі метадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

ПК-19. Распрацоўваць сацыяльна-культурныя праекты ў камерцыйнай, фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

ПК-21. Садзейнічаць пераходу ўстаноў культуры і мастацтваў на новыя ўмовы гаспадарання, садзейнічаць іх працы ва ўмовах рынкавых адносін, арганізоўваць знешнекультурную дзейнасць з замежнымі краінамі.

ПК-22. Праводзіць маркетынгавыя даследаванні, распрацоўваць і ажыццяўляць міжнародныя, рэспубліканскія, рэгіянальныя і мэтавыя сацыяльна-культурныя праекты.

ПК-23. Складаць рэкламную стратэгію культурна-адпачынкавых праграм, прымяняць методыку падбору слоганаў для культурных праектаў.

ПК-24. Распрацоўваць і праводзіць кампаніі па сувязях з грамадскасцю, узаемадзейнічаць са сродкамі масавай інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, падчас падрыхтоўкі да дзяржаўнага экзамену і ў яго працэсе вырашаюцца наступныя *задачы:*

– высвятленне наяўнасці ў выпускнікоў універсітэта сістэмы ведаў у галіне прыкладной культуралогіі;

– выяўленне ступені авалодання студэнтамі ўсеагульнымі заканамернасцямі функцыянавання культуры і асноў кіраўніцкай дзейнасці ў сацыякультурнай сферы;

– высвятленне грунтоўнасці ведаў па праблемах культурнай палітыкі і сацыякультурных інстытутаў;

– высвятленне ступені сфарміраванасці ў студэнтаў навуковага, практычнага і прагматычнага падыходаў да вывучэння з'яў культуры, якія грунтуюцца на авалоданні імі сучаснымі метадалагічнымі падыходамі.

У працэсе падрыхтоўкі студэнтаў да дзяржаўнага экзамену па дадзенай праграме яны павінны сістэматызаваць і паглыбіць *веды* па:

– асноўных заканамернасцях культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– методыцы прагназавання, планавання і ажыццяўлення дзейнасці ў галіне культуры;

– асноўных паняццях прыкладной культуралогіі;

– механізмах сацыякультурнай дзейнасці, культурнай палітыкі, заканамернасцях, сродках, метадах і формах далучэння чалавека да свету культуры;

– прыкладных аспектах культуралогіі.

У працэсе дзяржаўнага экзамену выпускнікі павінны паказаць *навыкі і ўменні*, якія неабходны для:

– ацэньвання стану, тэндэнцый і перспектыў развіцця сучаснай культуры;

– крытычнага ўспрымання разнастайных з'яў культуры ў іх суаднесенасці з іншымі сферамі сацыяльнай жыццядзейнасці;

– забеспячэння сацыяльна-культурнай і культуратворчай дзейнасці разнастайных сацыяльных інстытутаў;

– задавальнення і паслядоўнага развіцця духоўных патрэбнасцей і інтарэсаў суб'ектаў соцыуму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў пісьмова-вуснай форме і прадугледжвае падрыхтоўку разгорнутага адказу на два тэарэтычных пытання па асноўных вучэбных дысцыплінах, вынесеных на экзамен і ўваходзячых у інтэграваную вучэбную дысцыпліну «Прыкладная культуралогія»: «Тэорыя і гісторыя сацыяльна-культурнай дзейнасці», «Сцэнарнае майстэрства і драматургія культурна-адпачынкавых праграм», «Рэжысура культурна-адпачынкавых праграм», «Сацыяльна-культурнае праектаванне», «Арт-індустрыя».

Пры адказе на дзяржаўным экзамене выпускнік павінен прадэманстраваць добрае валоданне прафесійнай лексікай, самастойнасць мыслення, уменне аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю, уменне выкарыстоўваць базавыя веды для вырашэння задач.

Узровень падрыхтоўкі ацэньвае дзяржаўная экзаменацыйная камісія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## *Тэма 1. Прыкладная культуралогія як галіна культуралагічных ведаў*

Прыкладная культуралогія – навука аб кіраванні і рэгуляванні культурных працэсаў, раскрыцці сутнасці індывідуальнай і калектыўнай культурнай дзейнасці; механізмаў, метадаў і форм прыцягнення чалавека ў свет культуры.

Прыкладная культуралогія як вобласць культуралагічных ведаў, якая знаходзіцца на стыку паміж фундаментальнай культуралогіяй і гісторыяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй, этыкай, эстэтыкай, паліталогіяй, юрыспрудэнцыяй, тэорыяй кіравання і педагогікай.

Прыкладная культуралогія і сферы яе выкарыстання:

а) сацыялізацыя, інкультурацыя і акультурацыя асобы;

б) сацыякультурнае прагназаванне, праектаванне і рэгуляванне;

в) культуралагізацыя адукацыі;

г) тэорыя культурнай палітыкі і дзейнасці культурных інстытутаў;

д) ахова культурнай спадчыны;

е) музейная справа;

ж) краязнаўства;

з) сацыяльна-культурная дзейнасць;

е) індустрыя вольнага часу.

Прыкладная культуралогія як галіна ведаў, якая вызначае механізмы ўключэння чалавека ў працэс засваення, захавання, узнаўлення і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры, стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя, дае абгрунтаванне тэхналогій забеспячэння ўмоў для рэалізацыі духоўна-эўрыстычных і мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўлення іх сацыяльна-культурнай актыўнасці.

## *Тэма 2. Прыкладная культуралогія як тэарэтыка-метадалагічная аснова сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сутнасць прыкладной культуралогіі як навукі, якая адпавядае патрабаванням сацыяльнай практыкі і раскрывае прынцыпы выкарыстання тэарэтычных ведаў аб культуры і механізмаў хаменізацыі, сацыялізацыі і інкультурацыі асобы. Аб’ект і прадмет прыкладной культуралогіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкладная культуралогія як галіна культуралогіі, якая раскрывае метадалагічныя асновы, заканамернасці, прынцыпы, сродкі, метады і формы прыцягнення чалавека ў свет культуры. Прыкладная культуралогія як механізм стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя. Прыкладная культуралогія як галіна навуковых ведаў, якая абгрунтоўвае тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Сацыяльна-культурная дзейнасць як прадмет прыкладной культуралогіі: свет і чалавек у культуралагічным вымярэнні; прыкладная культуралогія як сродак навуковага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Прызначэнне прыкладной культуралогіі як тэарэтычнай асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці: прагназаванне, праектаванне і рэгуляванне культурных працэсаў; распрацоўка і рэалізацыя тэхналогій фарміравання спрыяльнага культурнага асяроддзя; вызначэнне шляхоў задавальнення і ўзбагачэння духоўных патрэбнасцей і інтарэсаў чалавека; высвятленне механізмаў арганізацыйна-метадычнага забеспячэння культурных працэсаў і развіцця творчых патэнцый асобы.

Месца тэорыі і гісторыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў структуры прыкладной культуралогіі.

### *Тэма 3. Роля і месца сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасным грамадстве*

Сацыяльна-культурная дзейнасць як з’ява духоўнай культуры грамадства, якая спрыяе фарміраванню сістэмы вытворчасці і распаўсюджвання культурна-эстэтычных каштоўнасцей. Сацыяльна-культурная дзейнасць як сродак рэалізацыі мэтавай установкі прыкладной культуралогіі – прыцягненне чалавека ў свет культуры. Змест гэтага працэсу ў аснове сваёй складае сацыяльна-культурная дзейнасць, а методыка ажыццяўлення пастаўленай мэты будуецца на прынцыпах сацыяльнай педагогікі, на тэхналогіі педагогікі сутворчасці.

Сацыяльна-культурная дзейнасць – неад’емная частка сістэмы грамадскага выхавання, як самастойная падсістэма агульнай сістэмы сацыялізацыі і адукацыі людзей, галоўнымі функцыямі якой з’яўляюцца: сацыялізацыя, інкультурацыя і індывідуалізацыя асобы; прапаганда здаровага ладу жыцця; забеспячэнне працэсу самарэалізацыі творчых патэнцый асобы ў пра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сторы яе жыцця; арганізацыя інтэлектуальна насычанага вольнага часу розных катэгорый насельніцтва.

Мэты і задачы сацыяльна-культурнай дзейнасці: стварэнне культурных прадуктаў як на прафесійнай, так і на аматарскай аснове; уключэнне чалавека ў сістэму ўспрымання і засваення каштоўнасцей культуры; арганізацыя захавання каштоўнасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры; трансляцыя культурнай інфармацыі, стварэнне магчымасцей для культурнага дыялогу; стварэнне спрыяльнага культурнага асяроддзя праз сацыяльна-педагагічныя, арганізацыйна-пасрэдніцкія і адміністрацыйна-кіраўнічыя функцыі.

Сацыяльна-культурная дзейнасць – базавая катэгорыя, якая ахоплівае розныя сацыякультурныя працэсы, а таксама тэхналогіі прафесійнай дзейнасці спецыялістаў.

*Тэма 4. Сацыялізацыя і інкультурацыя асобы як місія ўстаноў культуры*

Сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта скіраваны грамадствам і яго сацыяльнымі інстытутамі працэс далучэння чалавека да культуры і актыўнага ўключэння самога чалавека ў гэты працэс. Сацыяльна-культурная дзейнасць як механізм аптымізацыі працэсу сацыялізацыі, інкультурацыі і самарэалізацыі асобы, пераўтварэння яе з аб'екта культурна-асветніцкага ўздзеяння ў суб'ект сацыяльна-культурнай творчасці.

Сацыялізацыя асобы сродкамі сацыяльна-культурнай дзейнасці – пераўтварэнне кожнай асобы ў актыўнага, ініцыятыўнага суб'екта дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі новай сацыяльнасці.

Сацыялізацыя як працэс і вынік уключэння чалавека ў соцыум. Асноўныя сацыяльныя функцыі сацыялізацыі асобы: засваенне і ўзнаўленне ім сацыяльнага вопыту, прыняцце патрабаванняў, норм і прынцыпаў грамадскіх зносін. Роля ўстаноў культуры ў рэалізацыі асноўных сацыяльных функцый сацыялізацыі.

Інкультурацыя як працэс уключэння чалавека ў мір культуры, у сістэму ведаў аб каштоўнасцях сусветнай і айчыннай культуры і грамадскіх каштоўнасцей (сацыяльныя, палітычныя, маральныя, эстэтычныя, рэлігійныя і інш. каштоўнасці). Асноўныя кірункі дзейнасці ўстаноў культуры ў працэсе ін-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурацыі: культураахоўная, культурастваральная, культуратворчая, спасціжэнне мастацтва і культурна-інфармацыйных працэсаў, эстэтычнае асвойванне рэчаіснасці.

### *Тэма 5. Тыпалогія грамадскіх патрэбнасцей у сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Патрэбнасці як аб'ектыўная патрэба арганізма ў дакладных умовах жыццядзейнасці, як стан псіхікі чалавека, неабходнай для бесперапыннага функцыянавання. Патрэбнасці грамадскага развіцця ў функцыянаванні сацыяльна-культурнай дзейнасці як аснова культурнага развіцця і замацавання грамадскіх зносін.

Асноўныя грамадскія патрэбнасці ў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Патрэбнасць у здзяйсненні працэсу сацыялізацыі праз сацыяльна-культурныя інстытуты: сям'я, установы адукацыі, установы культуры і мастацтва, грамадскія арганізацыі і аб'яднанні і г. д. Функцыі сацыяльна-культурных інстытутаў у працэсе сацыялізацыі асобы.

Патрэбнасці ў захаванні і перадачы гісторыка-культурнай спадчыны. Традыцыя як механізм непасрэднай трансляцыі культурнай інфармацыі ў часе. Святочна-абрадавая дзейнасць як адзін з асноўных відаў у дзейнасці сацыяльна-культурных установ, як сродак сацыяльнага рэгулявання грамадскіх і асобасных зносін, як замацаванне міжпакаленных сувязей.

Патрэбнасць у сацыяльнай рэгуляцыі вольнага часу. Кіраванне дзейнасці людзей у мэтах іх развіцця і рацыянальнага выкарыстання вольнага часу як грамадскай патрэбнасці. Асноўныя мэты рэгулявання дзейнасці людзей ва ўмовах вольнага часу: забеспячэнне развіцця духоўных, творчых сіл чалавека; рацыянальная арганізацыя змястоўнага вольнага часу. Вольны час як сфера аднаўлення фізічных і псіхічных сіл чалавека, развіцця асобы.

### *Тэма 6. Тыпалогія асобасных патрэбнасцей у сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Патрэбнасці як аб'ектыўная патрэба арганізма ў дакладных умовах жыццядзейнасці, як стан псіхікі чалавека, неабходнай для бесперапыннага функцыянавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльна-культурная дзейнасць як духоўна-маральны спосаб існавання чалавека і задавальнення яго культурна-творчых і духоўных патрэбнасцей. Узаемасувязь функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці і задавальнення аб'ектыўных патрэбнасцей асобы. Актыўнасць суб'ектаў грамадскага жыцця як фактар задавальнення асобасных патрэбнасцей у сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Тыпалогія асобасных патрэбнасцей у сацыяльна-культурнай дзейнасці. Патрэбнасць у ацэньванні ўласных паводзін другімі людзьмі як неабходнасць карэкціроўкі сваіх паводзін і каштоўнасцей у соцыуме. Дзейнасць сацыяльна-культурных устаноў па стварэнні ўмоў для абмену інфармацыяй, фарміравання грамадскай думкі і грамадскага настрою.

Патрэбнасць у самазацвярджэнні, у атрыманні грамадскага прызнання. Мастацка-творчыя калектывы і аб'яднанні непрафесійнай накіраванасці як прастора для асобаснага самазацвярджэння і творчай самарэалізацыі. Кампенсатарныя функцыі сацыяльна-культурных аб'яднанняў.

Патрэбнасць асобы ў самавыражэнні і самаактуалізацыі. Здольнасць асобы да творчасці і патрэбнасць ёй займацца як высокі ўзровень самасвядомасці асобы. Дзейнасць сацыяльна-культурных і культурна-дасугавых устаноў па задавальненні патрэбнасці і самарэалізацыі і самаактуалізацыі.

Патрэбнасць у рэкрэацыі, узнаўленні псіхафізічных сіл чалавека. Сродкі, формы і метады арганізацыі рэкрэацыйнай дзейнасці ўстаноў сацыяльна-культурнай сферы.

### *Тэма 7. Сацыяльна-культурная дзейнасць як прыярытэтны кірунак дзяржаўнай культурнай палітыкі*

Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры і мастацтваў як сукупнасць заснаваных на канцэптуальным уяўленні аб ролі і месцы культуры ў жыцці грамадства арганізацыйна-кіраўнічых прынцыпаў, матэрыяльна-тэхнічных, фінансавых, інфармацыйных, кадравых рэсурсаў, прававога забеспячэння і практычных мер па рэалізацыі стваральнага патэнцыялу культуры, канцэнтрацыі намаганняў на прыярытэтных напрамках яе развіцця, сацыялізацыі і інкультурацыі асобы.

Культурная палітыка як сістэмны атрыбут агульнадзяржаўнай палітыкі, выпрацоўка сацыяльна-культурных каштоўнас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных арыенціраў, стварэнне магчымасцей для культурнага самаразвіцця асобы, развіцця грамадскіх рухаў і фарміраванняў у сферы культуры.

Прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці. Роля дзяржавы ў кіраванні сацыяльна-культурнай сферай: заканадаўчае і адміністратыўнае рэгуляванне; непасрэднае ажыццяўленне эканамічнай дзейнасці. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З).

Множнасць суб'ектаў культурнай палітыкі (органы дзяржаўнай улады, сацыяльна-культурныя інстытуты, творчыя работнікі). Сацыяльна-культурная дзейнасць як шматбаковая дзейнасць суб'ектаў, сутнасць якой складаюць працэсы асваення, захавання, стварэння, трансляцыі, распаўсюджвання і развіцця культурных каштоўнасцей у грамадстве. Кіраванне сацыякультурнай сферай як дзейнасць дзяржаўных інстытутаў па рэгуляванні сацыякультурных працэсаў у адпаведнасці з нормамі, прынцыпамі, мэтамі і задачамі культурнай палітыкі.

## *Тэма 8. Агульная характарыстыка суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Шматзначнасць суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Суб'екты сацыяльна-культурнай дзейнасці – носьбіты вызначаных пэўных ідэй, традыцый, ініцыятыў і тэхналогій. Віды суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці: асоба; сям'я; сацыяльныя арганізацыі і аб'яднанні; сацыяльна-культурныя інстытуты; органы дзяржаўнага кіравання, галіновыя ўстановы і арганізацыі.

Тыпалогія суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў залежнасці ад іх функцыянальнага прызначэння ў грамадстве.

Творчы блок – суб'екты вытворчасці (стварэння) і ўзнаўлення культурных каштоўнасцей. Камунікатыўны блок – суб'екты захоўвання і перадачы культурнай спадчыны, кіраўніцкай дзейнасці. Рэсурсны блок – інстытуты ўпраўленчыя, нарматыўна-прававога, інфармацыйна-метадычнага, фінансавага, матэрыяльна-тэхнічнага, кадравага і навуковага забеспячэння дзейнасці. Сацыяльна-дэмаграфічны блок – непасрэдныя спажыўцы і карыстальнікі культурных каштоўнасцей.

Асоба як суб'ект сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сацыяльны інстытут як адносна ўстойлівыя тыпы і формы сацыяльнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практыкі. Функцыянальна-мэтавая скіраванасць сацыяльна-культурных інстытутаў: нарматыўная (узнаўленне культурных і сацыяльных каштоўнасцей, уключэнне чалавека ў вызначаную субкультуру, ажыццяўленне шэрагу сацыякультурных функцый) і ўстаноўчая (арганізацыйна-творчыя, адміністрацыйна-кіраўнічыя структуры, арганізацыі грамадскага прызначэння).

### *Тэма 9. Асноўныя гістарычныя этапы развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Асноўныя гістарычныя этапы развіцця сацыякультурнай дзейнасці: асвета і ўзнікненне сацыяльна-культурных супольнасцей у XVII–XVIII стст.; грамадска-асветны рух і вольны час у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.

Сацыяльна-культурная дзейнасць у кантэксце рэвалюцыйных падзей у пачатку XX ст.; культурна-асветніцкая работа ў савецкі перыяд: агульныя рысы і кірункі развіцця: культурна-асветніцкая і палітыка-асветніцкая работа ў перыяд 1917–1941 гг. і ў 1941–1945 гг.; асаблівасці культурна-асветніцкай і сацыяльнай работы ў 1945–1955 гг.; сацыяльна-культурныя працэсы ў 1956–1990 гг.; станаўленне і развіццё сацыяльна-культурнай дзейнасці на сучасным этапе.

Сацыяльна-культурная дзейнасць як правапераемніца асноўных тэарэтычных і метадычных дасягненняў пазашкольнай адукацыі, палітыка-асветніцкай, культурна-асветніцкай работы, клубазнаўства. Пашыраныя функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: асветніцкая, культуратворчая, рэкрэацыйна-аздараўленчая, інфармацыйная, забаўляльная, сацыяінтэгратыўная.

### *Тэма 10. Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як галіна гуманітарных ведаў*

Паняцце сацыяльна-культурнай дзейнасці. Асноўныя крыніцы фарміравання тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: вывучэнне вопыту, эксперыментальная праца, выкарыстанне дасягненняў іншых навук і г. д.

Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як фундаментальны навукова-адукацыйны кірунак, які сінтэзуе навуковыя дасягненні культуралогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, педагогікі, пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ва, тэорыі кіравання, эканомікі і іншых галін ведаў. Структурны склад тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: паняційны апарат; сістэма выяўленых заканамернасцей; зыходныя прынцыпы; агульнапрынятыя тыпалогіі з'яў, характэрных для гісторыі і сучаснай практыкі.

Асноўныя навуковыя школы ў сучаснай тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: «Педагогіка вольнага часу» – Я. У. Трыодзін, «Тэхналогія культурна-адпачынкавай дзейнасці» – А. Д. Жаркоў, «Прыкладная культуралогія як тэарэтычная база сацыяльна-культурнай дзейнасці» – М. А. Арыярскі і інш. Аўтарскія падыходы да распрацоўкі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці (М. М. Ярашэнка, Т. Р. Кісялёва, Ю. Д. Красільнікаў, А. Д. Жаркоў, Т. І. Бакланава, М. А. Арыярскі, Ю. А. Стральцоў і інш. ). Уклад беларускіх даследчыкаў у развіццё тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці (М. І. Аксюцік, Я. Д. Грыгаровіч, Л. І. Казлоўская, М. М. Каралёў, А. А. Макарава, І. А. Малахава, С. Б. Майсяйчук, В. У. Рагачова, Н. У. Самерсава, І. Л. Смарговіч, А. І. Смолік і інш.).

Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як шырокая сукупнасць культуралагічных і педагагічных ведаў, непасрэдна звязаных з фундаментальнымі паняццямі: культура, выхаванне, сацыяльнае асяроддзе, сацыялізацыя, культурныя каштоўнасці і інш. Асноўныя функцыі тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: абагульненне, сістэматызацыя, выяўленне заканамернасцей, прагноз і навучанне кадраў.

Узаемасувязі і ўзаемаадносіны тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, яе методыкі і практыкі.

### *Тэма 11. Сутнасць і сувязь паняццяў «культурна-асветніцкая работа», «культурна-адпачынкавая дзейнасць», «сацыяльна-культурная дзейнасць»*

Гістарычная абумоўленасць паняццяў «культурна-асветніцкая работа», «культурна-адпачынкавая дзейнасць», «сацыяльна-культурная дзейнасць».

Культурна-асветніцкая работа як сістэма прафесійнай і грамадскай дзейнасці па ўключэнні розных груп насельніцтва ў працэс бесперапыннай асветы, мастацкай творчасці, адпачынку і забаў. Асвета як далучэнне асобы да культуры і мастацтва, узвышэнне сацыяльнай сутнасці чалавека.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Культурна-адпачынкавая дзейнасць як галіна сацыяльна-культурнай актыўнасці людзей, якая праяўляецца ў сферы вольнага часу. Гістарычная пераемнасць асноўных функцый культурна-асветніцкай работы.

Асноўныя значэнні паняцця «сацыяльна-культурная дзейнасць» як грамадская практыка, у якой задзейнічана мноства прафесій, неабходных для сучаснай сацыякультурнай сферы; як вучэбная дысцыпліна з азначанай логікай і структурай; як гістарычна абумоўленая галіна навуковых ведаў.

Складаючыя паняцця «сацыяльна-культурная дзейнасць»: «сацыяльнае», накіраванае на вывучэнне і стварэнне сумеснага жыцця і дзейнасці людзей, і «культурнае», накіраванае на дзейнасць чалавека па стварэнні культурных, матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей ці зберажэнне ўжо створаных каштоўнасцей і перадачу іх новым пакаленням.

Культурная дзейнасць як мэтанакіраваная і асэнсаваная актыўнасць чалавека, якая забяспечвае стварэнне, засваенне, зберажэнне, распаўсюджванне і далейшае развіццё духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей.

Уплыў грамадства на фарміраванне відаў і азначэнне функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 12. Агульныя прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці як важнейшыя метадалагічныя катэгорыі, якія характарызуюць сутнасць і дыялектыку развіцця сацыяльна-культурных працэсаў. Прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці як найбольш агульныя палажэнні, якія адлюстроўваюць устойлівыя сувязі і адносіны, якія складваюцца ў працэсе стварэння, засваення, захавання і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры і вызначаюць скіраванасць, характар, змест і формы сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Класіфікацыя прынцыпаў (агульнаідэалагічныя і спецыфічныя). Асноўныя прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці: эстэтызацыя грамадскага жыцця, комплекснасць выкарыстання культурастваральнага патэнцыялу прыроды і грамадства, этычнае напаўненне зместу сацыяльна-культурнай дзейнасці, адзінства інфармацыйна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаткаў, агульнадаступнасць, развіццё ініцыятывы і самадзейнасці, дыферэнцыраваны падыход, пераемнасць і паслядоўнасць арганізацыйна-выхаваўчых дзеянняў, прынцыпы дзейнаснага падыходу і мэтанакіраванасці.

Уплыў працэсаў сацыяльна-эканамічнага і духоўнага абнаўлення грамадства на трансфармацыю прынцыпаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 13. Функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасным грамадстве*

Паняцце функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Функцыя як адлюстраванне пэўных кірункаў і бакоў дзейнасці асобных людзей, супольнасці, сацыяльна-культурных інстытутаў, грамадскіх фарміраванняў і рухаў. Роля функцый у вызначэнні сутнасці, спецыфікі і сродкаў дасягнення мэты, спосабаў і прыёмаў засваення культурных каштоўнасцей у працэсе сацыяльна-культурнай дзейнасці. Функцыя як адлюстраванне грамадскіх патрэбнасцей кожнага канкрэтна-гістарычнага этапу развіцця грамадства.

Класіфікацыя функцый як адлюстраванне самых галоўных уласцівасцей сацыяльна-культурнай дзейнасці і асноўных кірункаў дзейнасці ўстаноў культуры. Функцыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: культураахоўная; культуратворчая; сацыяарганізацыйная; сацыяльна-педагагічная. Накіраванасць функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці на выхаванне, развіццё і самаразвіццё асобы, яе самарэалізацыю: развіццёвая, інфармацыйна-асветная, нарматыўная, камунікатыўная, культуратворчая, рэкрэацыйна-гульнявая.

Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць функцый у цэласным працэсе сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 14. Характарыстыка форм і метадаў сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сацыяльна-культурная дзейнасць як сістэма форм, сродкаў і метадаў, якія рэгулююць сацыяльныя працэсы і сацыяльныя паводзіны чалавека. Форма сацыяльна-культурнай дзейнасці як сукупнасць пэўных метадаў і сродкаў арганізацыі дзейнасці асобы і сацыяльных груп насельніцтва ва ўмовах вольнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часу, як спосаб арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці асобы і розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва.

Характарыстыка форм па ахопе насельніцтва: масавыя, групавыя, індывідуальныя; па спосабах уздзеяння: тэатралізаваныя, гульнявыя, ілюстрацыйныя; у залежнасці ад зместу і відаў дзейнасці: рэкрэацыйныя, інфармацыйныя, аматарскай творчасці, рэабілітацыйныя, спартыўна-аздараўленчыя і да т. п. Комплексныя формы.

Метад сацыяльна-культурнай дзейнасці як шлях дасягнення яе мэт, спосаб мэтанакіраванага ўздзеяння на аб'ект. Метад як сума прыёмаў, якія выкарыстоўваюцца ў дзейнасці сацыякультурнай установы ў мэтах развіцця і самаразвіцця асобы праз прадметную дзейнасць, задавальнення і далейшага развіцця духоўных патрэбнасцей і фарміравання грамадска каштоўнасных якасцей асобы. Асноўныя групы метадаў сацыяльна-культурнай дзейнасці (даследчыя, псіхолага-педагагічныя, асветніцкія) і іх характарыстыка.

Сродак сацыяльна-культурнай дзейнасці як прылада для дасягнення мэт. Асноўныя сродкі: мастацка-выразныя, матэрыяльна-тэхнічныя, фінансавыя, інфармацыйныя. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць форм, метадаў і сродкаў у адзіным працэсе сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 15. Агульная характарыстыка сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці – гэта духоўныя і матэрыяльныя віды дзейнасці, крыніцы і інструменты стварэння спрыяльнага культурнага асяроддзя, гэта «набор інструментаў», якія выкарыстоўваюцца падчас арганізацыі розных мерапрыемстваў для ідэйна-эмацыянальнага ўздзеяння на свядомасць, пачуцці і паводзіны людзей, уцягванне іх у свет культуры, у працэс стварэння, засваення, захавання, распаўсюджвання і далейшага ўзбагачэння каштоўнасцей культуры.

Асноўныя сродкі сацыяльна-культурнай дзейнасці: жывое слова, друк, радыё, тэлебачанне, наглядныя сродкі, мастацтва і спорт, літаратура і аматарская творчасць, інтэрнэт-матэрыялы, кнігі, музычныя інструменты, тэхнічныя сродкі: гуказапісныя, гукаўзнаўляльныя, праекцыйныя і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фактары залежнасці выбару сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці. Цесная ўзаемасувязь сродкаў сацыяльна-культурнай дзейнасці і іх абумоўленасць пэўным аб’ектам уздзеяння: дашкольнікі, падлеткі, моладзь, студэнты, пенсіянеры і г. д. Залежнасць выбару сродкаў ад тэматычнай накіраванасці мерапрыемства; ад мэты якога-небудзь мерапрыемства як выхаваўчай акцыі; менавіта мэта вызначае сродак; ад характару мастацка-пастановачных задач.

Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць форм, сродкаў і метадаў у адзіным працэсе сацыяльна-культурнай дзейнасці.

*Тэма 16. Інфраструктура сучаснай сацыякультурнай сферы*

Інфраструктура як сукупнасць установаў, арганізацый, фірм, прадпрыемстваў, фондаў, якія ажыццяўляюць працэс вытворчасці, захоўвання, распаўсюджвання, трансляцыі культурных каштоўнасцей.

Інфраструктура – комплекс умоў, якія забяспечваюць спрыяльнае развіццё сацыяльна-культурных працэсаў і задавальненне культурна-бытавых і сацыяльных патрэбнасцей людзей.

Сацыяльныя інстытуты культуры (тэатры, музеі, кінатэатры, клубныя ўстановы, цэнтры вольнага часу, паркі і інш.). Сістэма падрыхтоўкі кадраў і павышэнне іх кваліфікацыі. Навуковыя і навукова-метадычныя арганізацыі, спецыялізаваныя сродкі масавай інфармацыі. Кіраўніцкія органы, якія рэгулююць дзейнасць устаноў культуры.

Характарыстыкі развіцця асноўных сегментаў культурна-адпачынкавай індустрыі: індустрыя турызму; індустрыя забаў; арт-бізнес (галерэі, выставачныя залы); музычны і шоу-бізнес; спартыўна-відовішчная індустрыя; індустрыя моды; гульнявая індустрыя; тэлевізійная індустрыя; радыёіндустрыя. Новыя культурна-забаўляльныя ўстановы: антыкафэ, арт-кафэ і г. д.

*Тэма 17. Тыпалогія ўстаноў культуры ў Беларусі*

Установы культуры як сацыяльна-культурныя інстытуты, як суб’екты арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Установа культуры як дэмакратычны і агульнадаступны, гуманістычна арыентаваны сацыяльны інстытут, культурна-адукацыйная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прастора духоўнага і фізічнага станаўлення і развіцця асобы чалавека, яго самарэалізацыі і самавыяўлення.

Сацыяльна-культурныя інстытуты як утварэнні, што рэгулююць сацыяльную актыўнасць насельніцтва, надаюць сумесным дзеянням людзей змястоўнасць і сацыяльна-выхаваўчую значнасць. Тэарэтычная аргументацыя і практычная абумоўленасць працэсу стварэння новых інтэграваных мадэляў установ культуры як сацыяльна-культурных інстытутаў выхавання асобы.

Функцыі, змест і структура дзейнасці ўстаноў культуры ў розных рэгіёнах краіны (аграгарадок, гарадскі пасёлак, раённы цэнтр, вялікі горад і інш.). Клубная ўстанова як цэнтр вольнага часу, як сінтэтычны тып установы сацыяльна-культурнай сферы. Новыя тыпы ўстаноў культуры ў Беларусі: дамы фальклору, цэнтры рамёстваў, дамы народнай творчасці і інш.

Сучасная бібліятэка – неад'емная частка сістэмы бесперапыннай адукацыі і выхавання. Рэалізацыя пазашкольных форм сацыялізацыі, інкультурацыі і індывідуалізацыі асобы ў дзейнасці сучаснай бібліятэкі.

Культуратваральная, выхаваўчая, інфармацыйна-асветніцкая функцыі сучаснага музея. Роля музея ў стварэнні культурнага асяроддзя, культурна-адукацыйнай прасторы.

*Тэма 18. Клубныя ўстановы*
*як суб'ект сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Клубныя ўстановы Беларусі як агульнадаступны, гуманістычна зарыентаваны сацыяльны інстытут, які ажыццяўляе рэгуляванне сацыяльна-культурнымі працэсамі ў сферы вольнага часу, забяспечвае іх арганізаваны характар і сацыяльна-выхаваўчую накіраванасць.

Сучасныя клубныя ўстановы (дзяржаўныя клубныя ўстановы, грамадскія, камерцыйныя, прыватныя клубныя прадпрыемствы) як сацыяльна-культурныя інстытуты, дзе рэалізуецца прафесійная дзейнасць спецыялістаў у галіне арганізацыі вольнага часу. Задачы клубных устаноў: стварэнне неабходных умоў для задавальнення грамадскіх запатрабаванняў у адпачынку, аздараўленні, зносінах, развіцці культуры, творчасці, шматстайных форм дасугавай актыўнасці людзей; фарміраванне і развіццё асноў культурнага жыцця народа, забеспячэнне кожнаму члену грамадства гарантаванага доступу да культурнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спадчыны, а таксама магчымасць займацца сацыяльна-культурнай дзейнасцю.

Кірункі развіцця сучасных клубных установ як цэнтраў развіцця рэкрэацыйнай культуры розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва; творчых лабараторый аматарскай творчасці; акумулятараў творчай актыўнасці і ініцыятывы розных груп насельніцтва ў сферы вольнага часу; арганізатараў святочна-відовішчных праграм на аснове як традыцыйных, так і інавацыйных тэхналогій; каардынатараў культурнага жыцця і сацыякультурных працэсаў у рэгіёнах краіны.

### *Тэма 19. Сучасны музей у прасторы сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сучасны музей як сацыяльна-культурная ўстанова. Культурастваральная, выхаваўчая, інфармацыйна-асветніцкая функцыі сучаснага музея. Роля музея ў стварэнні культурнага асяроддзя, культурна-адукацыйнай прасторы.

Профілі музейных установ: краязнаўчыя; гістарычныя і этнаграфічныя; літаратурныя; мастацкія; музеі-запаведнікі; прыродазнаўчыя. Напрамкі развіцця сучасных музеяў: выкарыстанне магчымасцей музеяў ва ўнутраным і знешнім турызме; развіццё разнастайных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў; развіццё міжнародных сувязяў і супрацоўніцтва ў сістэме розных міжнародных арганізацый.

### *Тэма 20. Роля бібліятэкі ў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сучасная бібліятэка – неад’емная частка сістэмы бесперапыннай адукацыі і выхавання. Рэалізацыя пазашкольных форм сацыялізацыі, інкультурацыі і індывідуалізацыі асобы ў дзейнасці сучаснай бібліятэкі.

Улік дасугавых патрэб карыстальнікаў, іх сацыяльна-ўзроставых асаблівасцей як прынцып арганізацыі дзейнасці сучаснай бібліятэкі. Прафілізацыя публічных бібліятэк як інавацыйная форма арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання.

Мэтавыя праграмы і бібліятэчныя праекты па арганізацыі і змесце правядзення вольнага часу карыстальнікаў. Бібліятэкі сямейнага чытання – перспектыўная форма арганізацыі вольнага часу сям’і. Методыка стварэння аматарскіх аб’яднанняў пры

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

бібліятэцы: клубаў па агульнай зацікаўленасці розных кірункаў; літаратурна-музейнай гасцёўні, бібліятэчных лялечных тэатраў і інш.

Культурна-адпачынкавыя праграмы як форма арганізацыі дасуга чытальнікаў бібліятэкі.

### *Тэма 21. Канцэртна-відовішчныя арганізацыі як суб'екты сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Канцэртна-відовішчная дзейнасць як сацыякультурная з'ява. Разнастайнасць відаў і форм канцэртна-відовішчнай дзейнасці, абумоўленае агульнакультурнымі, пазнавальнымі, эстэтычнымі, сямейнымі і іншымі інтарэсамі, стварае шырокія ўмовы і магчымасці для самарэалізацыі.

Агульная характарыстыка суб'ектаў арганізацыі канцэртна-відовішчных праграм: філармоніі і канцэртныя агенцтвы, тэатральна-відовішчныя прадпрыемствы і прамоўтарскія фірмы, святочныя агенцтвы і прадзюсарскія цэнтры, начныя клубы і маладзёжныя забаўляльныя цэнтры, канцэртныя залы і студыі гуказапісу, музычныя і тэатральныя калектывы, сродкі масавай інфармацыі, спецыялісты ў галіне музычнай індустрыі і інш.

Дзяржаўныя канцэртна-відовішчныя арганізацыі рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання. Тэндэнцыі развіцця інфраструктуры канцэртна-відовішчнай сферы. Характарыстыка аўдыторыі канцэртна-відовішчных мерапрыемстваў. Шляхі творчага пошуку, арт-праекты і падыходы да арганізацыі канцэртна-відовішчных праграм для розных катэгорый насельніцтва.

### *Тэма 22. Выставы і галерэі як цэнтры сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Галерэйна-выставачная дзейнасць як сродак папулярызацыі твораў выяўленчага мастацтва і задавальнення мастацка-эстэтычных запатрабаванняў аўдыторыі.

Мастацкая галерэя як з'ява ў сучасным мастацкім рынку. Спалучэнне культурна-асветніцкай дзейнасці і эканамічных задач у дзейнасці мастацкіх галерэй. Роля выставак і галерэй у фарміраванні культурнага асяроддзя горада.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульная характарыстыка суб'ектаў галерэйна-выставачнай сферы: музеі, мастацкія галерэі, мастацкія салоны, аўкцыёны, арт-дылеры, калекцыянеры, студыі выяўленчага мастацтва і інш.

Спецыялізацыя суб'ектаў галерэйна-выставачнага рынку. Выставы і галерэі ў структуры крэатыўных індустрый. Асаблівасці арт-прадукцыі як мастацкіх твораў, якія маюць мастацкі кампанент і, адначасова, з'яўляюцца таварам на рынку культурных паслуг. Творчыя праекты.

### *Тэма 23. Сутнасць і тыпалогія тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Тэхналогія – спосаб ажыццяўлення дзейнасці на аснове яе рацыянальнага раздзялення на працэдуры і аперацыі з іх наступнай каардынацыяй і сінхранізацыяй. Сацыяльна-культурныя тэхналогіі як сістэмная паслядоўнасць тэхналагічных працэсаў, якія ўключаюць найважнейшыя алгарытмы сумесных дзеянняў аўдыторыі.

Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці як сукупнасць форм, метадаў, методык, сродкаў, а таксама мадэляў сацыяльных паводзін чалавека ў працэсе нерэгламентаванай і сацыяльна значнай дзейнасці, накіраванай на рэалізацыю задач інкультурацыі і сацыялізацыі асобы. Тэхналогія сацыяльна-культурнай дзейнасці як цэласны працэс, звязаны адзінствам мэт, разнастайнасцю метадаў, прыёмаў, сродкаў, форм узаемадзеяння з педагагічнай тэхналогіяй. Прыкметы класіфікацыі тэхналогій (гісторыка-змястоўны; функцыянальны або працэсуальны; сацыяльна-дэмаграфічны, «субкультурны», узровень інаватыкі і механізма ажыццяўлення наваўвядзення ў сацыякультурнай сферы). Многамэтавы характар тэхналогій: жыццезабеспячэнне, сацыялізацыя, камунікацыя, рэкрэацыя (адпачынак) і рэабілітацыя (аднаўленне).

Базавыя тэхналагічныя падсістэмы сацыяльна-культурнай дзейнасці: рэкрэацыйныя, камунікатыўныя, гульнявыя, інфармацыйна-адукацыйныя, крэатыўна-творчыя, святочна-відовішчныя, анімацыйныя і праектныя.

Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як упарадкаванне ўсіх элементаў тэхналагічнага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 24. Кампаненты зместу тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Паняцце «сацыяльны заказ». Ланцужок тэхналагічнага працэсу: мэтавая ўстаноўка – задачы – змест – форма – метады – сродкі – суб’ектна-аб’ектныя і аб’ектна-субъектныя адносіны – матэрыяльна-тэхнічнае, фінансавае забеспячэнне і кадравае забеспячэнне – карэкціроўка мэты – канчатковыя вынікі. Падсістэмы тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці: арганізацыйная, метадычнай дзейнасці, псіхалагічная.

Асноўныя кампаненты зместу тэхналогій: кагнітыўны вопыт асобы, які ўключае сістэму ведаў аб прыродзе, грамадстве, мысленні, тэхніцы, спосабах дзейнасці; канкрэтна-практычны вопыт асобы, заснаваны на сістэме агульных інтэлектуальных і практычных уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць розныя віды дзейнасці і здольнасць асобы да захавання культуры; вопыт крэатыўна-творчай дзейнасці асобы, камунікатыўны вопыт дзейнасці, заснаваны на сістэме матывацыйна-каштоўнасных і эмацыянальна-валявых адносін асобы да свету, прыроды, грамадства і іншых людзей.

Тэарэтычныя падыходы да распрацоўкі тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці: канцэптуальнасць, сістэмнасць, кіруемасць, эфектыўнасць, узнаўляльнасць.

*Тэма 25. Структура тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці як упарадкаванне ўсіх элементаў тэхналагічнага працэсу. Асноўныя этапы тэхналагічнага працэсу ва ўстановах культурна-дасугавага тыпу: аналіз становішча, фармулёўка мэты, планаванне праграмы, стварэнне праграмы: карэкціроўка мэты, рэпетыцыі, правядзенне праграмы, аналіз праведзенай праграмы.

Змест структуры кожнай з тэхналогій.

Канцэптуальнае абгрунтаванне тэхналогіі як абгрунтаванне мэтазгоднасці дадзенай тэхналогіі ў дадзеным выпадку для вырашэння сацыяльна значнай задачы, якая забяспечвае інкультурацыю асобы ў прасторы дасугавай дзейнасці.

Кантэкстуальны падыход, які прадугледжвае дакладную ацэнку знешніх абставін і асаблівасцей асяроддзя (соцыуму), дзе прайграваецца дадзеная тэхналогія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змястоўная частка, у якой адлюстроўваецца спосаб дасягнення меркаванага выніку сумеснай дзейнасці людзей, якія задавальняюць культурныя інтарэсы і патрэбнасці.

Працэсуальная частка з падрабязнай распрацоўкай паслядоўнасці арганізацыйных дзеянняў, у тым ліку мадэляў паводзін аўдыторыі, метады і сродкі дзейнасці ўдзельнікаў мерапрыемства; аналітычная частка, якая прадугледжвае падвядзенне вынікаў (адпаведную рэфлексію) ажыццёўленага мерапрыемства.

Вынікова-аналітычны блок, які прадугледжвае падвядзенне вынікаў (адпаведную рэфлексію) ажыццёўленага мерапрыемства.

### *Тэма 26. Рэкрэацыйна-аздараўленчыя тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Паняцце «рэкрэацыя». Рэкрэацыя як патрэба арганізма ў псіхафізіялагічнай разрадцы. Рэкрэацыя як працэс узнаўлення фізічных, інтэлектуальных і духоўна-эмацыянальных сіл асобы, як змена відаў дзейнасці і яе кантраснасць з вытворчай і бытавой дзейнасцю. Вядучая функцыя сацыяльна-культурнай рэкрэацыі – псіхафізічная разрадка і эмацыянальны адпачынак. Тыпы і віды адпачынку.

Мэты і задачы рэкрэацыйных тэхналогій як інструмента аздараўлення ладу жыцця і павышэння культуры быту ў арганізацыйным працэсе адпачынку і забаўляння. Сутнасць і асаблівасці рэкрэацыйных тэхналогій. Псіхафізіялагічныя і сацыякультурныя асаблівасці рэкрэацыі.

Псіхолага-педагагічная аснова рэкрэацыйных тэхналогій. Фактары, якія спрыяюць рэкрэацыі: прыродныя ўмовы, зносіны з мастацтвам, фізічныя рухі, інтэлектуальныя практыкаванні. Разнастайнасць сродкаў, форм і метадаў рэкрэацыі ў працэсе сацыяльна-культурнай дзейнасці. Інтэлектуальныя, гульнявыя, відовішчна-забаўляльныя, фізкультурна-аздараўленчыя кампаненты рэкрэацыйных тэхналогій. Педагагічныя задачы тэхналогій рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці.

Выкарыстанне ў рэкрэацыйных і аздараўленчых тэхналогіях новых сродкаў, метадаў, форм: музычна-тэатральна-аздараўленчыя праекты, фітнес-праграмы, арт-тэрапія, бібліятэрапія і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 27. Гульнявыя тэхналогіі ў сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Гульня як форма актыўнай дзейнасці ва ўмовах і сітуацыях, у якіх выяўляюцца эмацыянальныя, інтэлектуальныя і маральныя навыкі і здольнасці. Сацыяльнае паходжанне, змест і сутнасць гульні. Дзве іпастасі гульні. Гульня як сродак навучання і выхавання – ведаць, умець, пераймаць. Функцыі гульні (сацыякультурная, міжнацыянальная камунікацыя, самарэалізацыі, камунікатыўная, дыягнастычная, гульнятэрапеўтычная, карэкцыя, забаўляльная).

Народныя гульні: абрадавыя, рытуальныя, забаўляльныя, спартыўныя, інтэлектуальныя, азартныя, гульні для розных узроставых катэгорый. Спартыўныя: спаборніцтвы на спрыт, сілу, хуткасць. Гульнявыя праекты. Віды і тыпы гульнявых праектаў. Залежнасць выбару праекта ад аўдыторыі, улік яе ўзроставых, сацыяльных, псіхалагічных і асобасных асаблівасцей. Падбор гульняў па характары мадэляваных сітуацый, па характары гульнявога працэсу, па спосабах перадачы і перапрацоўкі інфармацыі.

Тры кампанента ў гульнявых тэхналогіях. Відовішчна-арганізацыйная форма, сацыяльна-педагагічная значнасць працэсу гульні, кваліфікацыя вядучага гульнявой праграмы. Адзінства рацыянальнага і эмацыянальнага ў гульнявых праектах. Сутнасць і сацыяльныя функцыі культурна-адпачынкавай дзейнасці.

*Тэма 28. Аматарская мастацкая творчасць у структуры сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Аматарская творчасць як частка народнай мастацкай культуры, як спосаб мастацкага асваення рэчаіснасці, стварэння і распаўсюджвання культурных каштоўнасцей. Аматарская мастацкая творчасць – форма праяўлення сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў сферы мастацтва. Аматарская творчасць як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па стварэнні, засваенні, распаўсюджванні культурных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу.

Жанравая структура аматарскай мастацкай творчасці. Функцыі аматарскай мастацкай творчасці: выхаваўчая, культуратворчая, рэкрэацыйна-забаўляльная, кампенсатарная, камуніка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўная, інфармацыйна-асветніцкая, мастацка-адукацыйная, развіцця асобы.

Аматарскія мастацкія калектывы як грамадска-культурныя аб'яднанні аматараў музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтваў. Аўтарская і выканальніцкая аматарская творчасць. Суб'екты арганізацыі мастацкай творчасці. Стварэнне спрыяльных умоў для развіцця мастацкай аматарскай творчасці. Сацыяльна-педагагічныя асновы калектыўнай дзейнасці ў сферы аматарскай мастацкай творчасці. Арганізацыйна-педагагічная дзейнасць у сферы аматарскай мастацкай творчасці: святы, конкурсы, канцэрты, агляды, інш.

*Тэма 29. Фестывальныя традыцыі ў сферы аматарскай мастацкай творчасці*

Фестываль як грамадска-культурная, мастацкая акцыя, якая характарызуецца комплексным вырашэннем мастацка-эстэтычных, сацыяльна-педагагічных і навукова-метадычных задач. Роля фестываляў у развіцці і ўдасканаленні творчага патэнцыялу аматарскай мастацкай творчасці; аднаўленні, захаванні і забеспячэнні пераемнасці лепшых здабыткаў беларускай культуры і мастацтва.

Сацыяльна-культурныя функцыі фестывальных мерапрыемстваў. Фестывалі аматарскай творчасці як спосаб дэманстрацыі здабыткаў у пэўных галінах мастацкай культуры, як адлюстраванне стану развіцця відаў і жанраў мастацкай творчасці.

Спецыфічныя асаблівасці фестываляў, іх адрозненне ад іншых відаў масавых сацыяльна-культурных мерапрыемстваў. Віды фестывальных мерапрыемстваў, іх класіфікацыя. Святочна-абрадавая культура як выток фестывальных традыцый народнай мастацкай творчасці. Дэтэрмінаванасць зместу і форм святочнай дзейнасці этнакультурнымі традыцыямі, сацыяльна-эканамічнымі і іншымі фактарамі.

Сацыядынаміка фестывальных традыцый народнай мастацкай творчасці ў сярэдзіне 90-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст. Карта фестываляў народнай мастацкай творчасці ў Беларусі. Жанрава-відавая разнастайнасць фестываляў народнай мастацкай творчасці. Фестываль як форма міжнароднага культурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемадзеяння. Шляхі станаўлення фестывальнага менеджменту ў сферы аматарскай творчасці.

### *Тэма 30. Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Інфармацыйна-асветніцкая функцыя ў сістэме сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сучасныя праблемы і канцэпцыі развіваючага вольнага часу: «рацыянальны вольны час», «адукацыйны вольны час», «тэрапеўтычны вольны час», іх інфармацыйнае забеспячэнне. Інфармацыйна-адукацыйныя тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Канцэптуальныя асновы адукацыйных тэхналогій: фарміраванне агульначалавечай сістэмы навуковых ведаў, практычных уменняў і навыкаў, светапоглядных і маральна-эстэтычных ідэй, цэнасна-значных запытаў і намераў, далучэнне да самаадукацыі і да т. п.

Стварэнне ўмоў у сферы вольнага часу для прафесійнай, эстэтычнай, культуралагічнай і іншай самаадукацыі. Выхаванне інфармацыйнай культуры. Асветніцкая дзейнасць ва ўстановах культуры, мастацтва, вольнага часу. Формы і метады інфармацыйна-асветніцкай дзейнасці.

Зносіны як спецыфічны спосаб камунікацыі і адмысловая форма ўзаемадзеяння паміж людзьмі. Тэхналогіі камунікацыйна-займальнай практыкі і арганізацыя зносін у сферы вольнага часу. Тыпы камунікацыйных зносін. Вывучэнне асяроддзя і мадэляў зносін, аналіз інфармацыі, планаванне асноўных напрамкаў, форм, метадаў, сродкаў камунікацыі, аналіз выніковасці, карэкцыя.

### *Тэма 31. Тэхналогіі святочна-відовішчнай дзейнасці ўстаноў культуры*

Паняцце «відовішча». Забаўляльная, пазнавальная, выхаваўчая, рэкрэацыйная, геданічная функцыі відовішчаў. Віды і тыпы відовішчаў: канцэрты, забаўляльныя праграмы, тэле- і радыёпраграмы, фестывалі, конкурсы і да т. п.

Святочная культура як неад’емная частка жыцця грамадства. Дэтэрмінаванасць святочнай дзейнасці этнакультурнымі, гістарычнымі, рэлігійнымі, грамадскімі традыцыямі, а таксама сацыяльна-палітычнымі, эканамічнымі і іншымі фактарамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сувязь святочных традыцый з прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі, сацыяльнай структурай грамадства, узроўнем развіцця вытворчых сіл.

Класіфікацыя свят, абрадаў і відовішчаў. Спецыфічныя асаблівасці зместу разнастайных груп свят, абрадаў і відовішчаў. Асноўныя формы святочнай дзейнасці ў Беларусі. Каляндарныя і сямейна-абрадавыя традыцыі ў сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Асноўныя характэрныя рысы відовішчаў: займальнасць, знешняя кідкасць, яркасць, святочнасць, здольнасць заінтрыгаваць гледача, гумар, камедыйнасць. Традыцыі і наватарства ў стварэнні святочнай культуры. Аднаўленне традыцыйных і стварэнне новых форм святочнай культуры: карнавалы, спартыўныя фестывалі, прэзентацыі касметычнай і моднай прадукцыі, святы дзіцячай і юнацкай творчасці.

### *Тэма 32. Сцэнарый культурна-адпачынкавай праграмы як яе драматургічная аснова*

Драматургія адпачынкавых праграм як важная частка тэхналогіі сацыяльна-культурнага працэсу. Характарыстыка паняцця «культурна-адпачынкавая праграма» і асноўныя падыходы да іх класіфікацыі. Агульныя і спецыфічныя рысы драматургіі культурна-адпачынкавых праграм і іншых драматургічных відаў мастацтва. Сцэнарый як спосаб фіксацыі будучага драматургічнага дзеяння адпачынкавай праграмы.

Аўтарская ідэйна-тэматычная задума – аснова будучай культурна-адпачынкавай праграмы. Звышзадача і ракурс як адлюстраванне аўтарскай задумы. Характарыстыка паняццяў «сцэнарны план», «літаратурны сцэнарый», «мантажны ліст» у кантэксце асноўных этапаў работы над сцэнарыем. Асноўныя графы мантажнага ліста як рэжысёрскай партытуры адпачынкавай праграмы. Асаблівасці гукавой і светлавой партытур.

Вызначэнне канструктыўных элементаў як важнейшы этап творчай дзейнасці сцэнарыста. Азначэнне паняццяў «архітэктоніка», «кампазіцыя».

Характарыстыка асноўных кампазіцыйных элементаў сцэнарыя: экспазіцыя, завязка, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка і фінал.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Псіхалагічная функцыя экспазіцыі і завязкі і іх кампазіцыйнае значэнне. Падпарадкаванасць асноўнага развіцця дзеяння раскрыццю ідэйна-тэматычнай задумы і сюжэтнаму ходу. Кульмінацыя як вяршыня развіцця драматургічнага дзеяння і вышэйшы эмацыянальны пункт успрымання гледачом праграмы. Развязка і фінал і іх значэнне ў завяршэнні сюжэтнай лініі сцэнарыя. Спосабы актывізацыі аўдыторыі ў фінале праграмы.

Асноўныя законы кампазіцыі: цэласнасць, узаемасувязь і супадначаленасць частак цэламу, падначаленасць выразных сродкаў аўтарскай задуме. Нумар і эпізод як адзінкі сцэнічнай інфармацыі. Паняцце «бесперапыннае драматургічнае дзеянне» і ўмовы яго дасягнення.

*Тэма 33. Сістэма К. С. Станіслаўскага*
*як практычны дапаможнік у дзейнасці*
*рэжысёра культурна-адпачынкавых праграм*

Паняцце «рэжысура». Асаблівасці рэжысёрскага мастацтва ў сучасным тэатры. Рэжысёр – тлумачальнік драматургіі, аўтар сцэнічнай кампазіцыі. Рэжысёр – выхавацель творчай індывідуальнасці акцёра. Рэжысёр – арганізатар творчага працэсу.

Сістэма К. С. Станіслаўскага як падмурак дзейнасці рэжысёра культурна-адпачынкавых праграм. Асноўныя паняцці сістэмы К. С. Станіслаўскага: звышзадача, скразное дзеянне, прапануемыя абставіны, магічнае «калі б…».

Звышзадача спектакля. Узаемасувязь аўтарскай ідэі рэжысёра культурна-адпачынкавых праграм і яго звышзадачы. Скразное дзеянне як шлях увасаблення звышзадачы. Слоўнае дзеянне і яго асаблівасці ў культурна-адпачынкавай праграме.

Агульнае і асаблівае ў тэатральнай рэжысуры і рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм.

*Тэма 34. Прынцыпы і прыёмы*
*рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм*

Рэжысура як арганізацыя відовішчнага боку культурна-адпачынкавай праграмы. Поліфункцыянальнасць культурна-адпачынкавых праграм. Рэжысура аўдыторыі. Віды ўзаемадзеяння ўдзельнікаў культурна-адпачынкавай праграмы. Спецыфічныя рысы аўдыторыі культурна-адпачынкавых праграм і механізмы ўздзеяння на яе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэжысёрская задума як вобразнае бачанне будучай адпачынкавай праграмы. Суадносіны рэжысёрскай і драматургічнай задумы ў культурна-адпачынкавай праграме. Характэрныя рысы рэжысёрскай задумы.

Прынцыпы рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Агульнамастацкія, эстэтычныя законы відовішчных мастацтваў і іх узаемасувязь са сцэнічнымі законамі актывізацыі аўдыторыі. Педагагічная складаючая прынцыпаў рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм.

Веданне прыёмаў рэжысуры як спосаб авалодання рамяством пастаноўшчыка. Прыём як сродак увасаблення рэжысёрскай задумы. Характарыстыка асноўных прыёмаў рэжысуры: сцэнічная рэалізацыя метафары, наўмыснае раскрыццё фабулы, прыём паўтору (рэфрэн), выкарыстанне экрана, перанос сцэнічнага дзеяння ў глядзельную залу і інш.

Асаблівасці рэжысёрскай арганізацыі тэмпарытму адпачынкавай праграмы. Прасторавае рашэнне культурна-адпачынкавай праграмы, асаблівасці сцэнаграфіі ў залежнасці ад сцэнічнай прасторы. Мізансцэна як «мова рэжысёра» і пластычны малюнак адпачынкавай праграмы. Віды мізансцэн: паралельныя, дыяганальныя, перпендыкулярныя, кругавыя і інш.

### *Тэма 35. Выразныя сродкі рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм*

Механізмы ўздзеяння культурна-адпачынкавай праграмы на аўдыторыю. Месца і роля выразных сродкаў у змястоўным, інтэлектуальным, эмацыянальным і педагагічным уздзеянні адпачынкавай праграмы.

Характарыстыка выразных сродкаў культурна-адпачынкавых праграм: мастацкае слова і слова вядучага, музыка, кіна- і відэаматэрыялы, харэаграфічныя і пластычныя кампазіцыі, свет і гук. Узаемадзеянне і суадносіны выразных сродкаў. Праблема адбору. Падпарадкаванне выразных сродкаў сцэнарна-рэжысёрскай задуме культурна-адпачынкавай праграмы.

Сімвал, метафара і алегорыя як выразныя сродкі рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Асаблівасці выкарыстання сімвала і алегорыі ў рэалізацыі сцэнарна-рэжысёрскага ходу адпачынкавай праграмы. Тыпы метафар. Метафара ў сцэнаграфіі. Метафара мізансцэны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 36. Мантажны метад*
*арганізацыі сцэнарнага матэрыялу*

Мантаж як «думка мастака, якая выражана ў адборы і супастаўленні кускоў дзеяння» (М. Ром). Мантаж як «неадлюстраваны змест». Мантаж у кінематографе.

Віды і прыёмы мантажу ў сцэнарыі культурна-адпачынкавай праграмы: паслядоўны (храналагічны) мантаж; мантаж па кантрасце, які адлюстроўвае «вастрыню стыку» нумароў у эпізодзе культурна-адпачынкавай праграмы; паралельны мантаж у кінематографе і сцэнарыі культурна-адпачынкавай праграмы, лейтматыў як «напамінанне»: музычны і візуальны лейтматыў, «імгненная смерць кадра» (кліп).

Функцыі мантажу ў сцэнарыі культурна-адпачынкавай праграмы: раскрыццё ідэйна-тэматычнай задумы; наданне цэласнасці культурна-адпачынкавай праграме; арганізацыя ўспрымання гледачом; арганізацыя тэмпарытму праграмы.

Асацыятыўнасць як агульная ўласцівасць творчага мантажу.

*Тэма 37. Асаблівасці драматургіі і рэжысуры*
*тэатралізаваных форм культурна-адпачынкавых праграм*

Паняцце «тэатралізацыя». Агульная характарыстыка тэатралізаваных форм адпачынкавых праграм: літаратурна-музычная кампазіцыя, тэматычны вечар, тэатралізаваны канцэрт, свята і інш.

Асаблівасці мантажу літаратурна-мастацкіх і музычных элементаў (нумароў) у літаратурна-музычнай кампазіцыі. Асноўныя патрабаванні да яе архітэктонікі: дынамічнасць пабудовы матэрыялу, прапарцыянальнасць у адборы і прымяненні літаратурнага і музычнага матэрыялу, адпаведнасць музыкі літаратурнаму тэксту і агульнай атмасферы праграмы, захоўванне тэмпарытму. Асаблівасці рэжысуры музычна-паэтычнага прадстаўлення.

Сцэнарый тэатралізаванага тэматычнага вечара і яго асаблівасці. Адрозненне тэматычнага вечара ад літаратурна-музычнай кампазіцыі. Віды тэматычных вечароў. Асаблівасці адбору «фактаў жыцця» і іх выкарыстанне ў сцэнарыях тэатралізаваных тэматычных вечароў. Асаблівасці мантажу «фактаў жыцця» і «фактаў мастацтва» ў рэжысуры тэматычнага вечара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатралізаваны канцэрт як разнавіднасць масавага прадстаўлення. Гісторыя ўзнікнення і развіцця гэтай формы культурна-адпачынкавых праграм. Спецыфічныя рысы тэатралізаванага канцэрта. Мантаж мастацка завершаных нумароў як адметнасць яго драматургіі. І. М. Туманаў аб кампазіцыйнай пабудове тэатралізаванага канцэрта. Вядучы ў тэатралізаваным канцэрце.

Поліфункцыянальнасць тэатралізаванага свята. Спецыфічныя асаблівасці яго драматургіі. Характарыстыка сродкаў уздзеяння на аўдыторыю свята. Улік асаблівасцей пляцоўкі для правядзення свята пры яго сцэнарна-рэжысёрскай распрацоўцы.

### *Тэма 38. Сутнасць і спецыфіка сацыяльна-культурнага праектавання*

Прыкладная культуралогія як тэарэтычная база сацыяльна-культурнага праектавання. Тэарэтыка-медалагічныя падыходы да сацыяльна-культурнага праектавання.

Метадалогія сацыяльна-культурнага праектавання: падыходы да канструявання тэорыі. Культуралагічны падыход да стварэння тэарэтычнага базісу. Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да сацыяльна-культурнага праектавання: праграмна-мэтавы, праблемны, сітуацыйны, сістэмны, рэгіянальны.

Мэты і задачы сацыяльна-культурнага праектавання. Яго функцыі, прынцыпы і кірункі. Праектная дзейнасць: метады і тэхналогіі. Асаблівасці структуры сацыяльна-культурнай праектнай дзейнасці і яе асноўных этапаў. Сацыяльна-культурная сфера як аб'ект праектавання.

Суадносіны паняцця «праектаванне» з паняццямі «прагназаванне», «праграмаванне», «мадэляванне» і «планаванне», «канструяванне», «прадбачанне». Характарыстыка паняццяў «сацыяльна-культурны праект» і «сацыяльна-культурная праграма». Прыярытэтныя галіны сучаснага праектавання.

### *Тэма 39. Сацыяльна-культурнае праектаванне як навукова-практычная дзейнасць*

Сутнасць праектавання, суб'ект і аб'ект праектнай дзейнасці. Мэты, задачы, прынцыпы і кірункі праектавання. Віды праектавання. Асаблівасці сацыяльна-культурных праектных тэх-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

налогій: складанасць і дынамічнасць сацыяльных аб'ектаў, працэсаў і з'яў; неабмежаванасць жорсткімі нарматыўнымі, эканамічнымі патрабаваннямі; разнастайнасць суб'ектаў.

Сацыяльна-культурнае праектаванне як навукова-практычная дзейнасць, накіраваная на разработку і рэалізацыю тэхналагічна забяспечаных варыянтаў вырашэння актуальных і перспектыўных праблем сацыяльна-культурнай сферы. Узроўні лакалізацыі праектнай дзейнасці. Класіфікацыя сацыяльна-культурных праектаў па змястоўным, функцыянальным і сацыяльна-дэмаграфічным крытэрыі. Асаблівасці сацыяльна-культурных праектных тэхналогій: складанасць і дынамічнасць сацыяльных аб'ектаў, працэсаў і з'яў; неабмежаванасць жорсткімі нарматыўнымі, эканамічнымі патрабаваннямі; разнастайнасць суб'ектаў.

### *Тэма 40. Тыпалогія сацыяльна-культурных праектаў*

Прыкметы тыпалогіі сацыяльна-культурных праектаў: змястоўныя, функцыянальныя і сацыяльна-дэмаграфічныя. Мегапраект, мікрапраекты і малыя праекты ў сістэме сацыяльнага развіцця. Прэстыж-праекты. Псеўдапраекты.

Тыпы праектаў: навукова-тэхнічны, арганізацыйны, эканамічны, сацыяльны, змешаны. Віды праектаў: інвестыцыйны, інавацыйны, даследчыцкі, навучальна-адукацыйны, камбінаваны і інш. Класы, маштабы і працягласць праектаў. Культурна-адпачынкавыя праграмы, культурныя акцыі, святы і фестывалі як асноўныя формы рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў.

Роля праектаў у развіцці арганізацыі. Асноўныя характарыстыкі праекта: мэтавая аўдыторыя, часовая абмежаванасць, каардынаваныя ўзаемасувязі, унікальнасць. Сутнасць праектнай дзейнасці ўстаноў сферы культуры, яе характарыстыка. Сацыяльна-культурнае праектаванне як спецыялізаваная тэхналогія кіравання.

Тыпы праектаў на беларускім рынку спажывання і вытворчасці культурных прадуктаў і паслуг.

### *Тэма 41. Культурная палітыка як вектар сацыяльна-культурнага праектавання*

Культурная палітыка як сукупнасць ідэалагічных прынцыпаў і практычных мер. Культурная палітыка дзяржавы і кіра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне сацыяльна-культурнымі працэсамі. Мэты, задачы, сродкі і прынцыпы культурнай палітыкі. Суб'екты культурнай палітыкі: дзяржава, адукацыя, рынак, царква. Мадэлі культурнай палітыкі (ЗША, Германія, Вялікабрытанія, Скандынаўскія краіны і інш.).

Сацыяльна-культурны праект як сродак замацавання ў грамадстве каштоўнасцей культуры: вітальна-біялагічных, палітычных, сацыяльных, маральных, эстэтычных, рэлігійных, сямейных і інш. Праектаванне як варыянт інавацыйнай, творчай і кіраўніцкай дзейнасці, накіраванай на канструяванне жадаемага стану аб'екта, прадмета, з'явы, як распрацоўка і рэалізацыя тэхналагічна забяспечаных варыянтаў вырашэння актуальных і перспектыўных праблем сацыяльна-культурнай сферы ў адпаведнасці з прыярытэтамі дзяржаўнай культурнай палітыкі.

Сацыяльна-культурнае праектаванне як стварэнне арганізацыйна-эканамічных умоў развіцця культурнага жыцця з улікам гісторыка-культурных традыцый, рэсурсаў і задач дзяржаўнай культурнай палітыкі.

### *Тэма 42. Сацыяльна-культурнае праектаванне ў сістэме распрацоўкі і рэалізацыі рэгіянальнай культурнай палітыкі*

Рэгіён як пэўны аб'ект кіравання. Разнастайнасць тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Рэгіянальная культурная палітыка як дзейнасць дзяржаўных структур, звязаная з фарміраваннем і рэгуляцыяй сацыяльных механізмаў і ўмоў культурнай актыўнасці як насельніцтва ў цэлым, так і жыхароў рэгіёнаў.

Абумоўленасць рэгіянальнага праектавання рэгіянальнай спецыфікай і яго сацыяльная і культурная запатрабаванасць.

Накіраванасць праектнай дзейнасці на рэгуляванне сацыяэканамічнага і сацыякультурнага развіцця рэгіёнаў; на сцвярджэнне самабытнасці культуры кожнага этнарэгіёна краіны як важнага фактару нацыянальнага адзінства і салідарнасці; на ахову культурнай спадчыны; на садзейнічанне творчай актыўнасці насельніцтва; на аптымізацыю сеткі ўстаноў культуры ў рэгіёнах і ўдасканаленне іх дзейнасці; стварэнне арганізацыйна-эканамічных умоў развіцця культурнага жыцця з улікам гісторыка-культурных традыцый, эканамічнай і рэсурснай базы.

Узаемасувязь працэсаў і тэндэнцый культурнага жыцця на глабальным і рэгіянальным узроўнях, яе адлюстраванне ў пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ектных вырашэннях. Праектаванне як інструмент рэалізацыі актыўнай сацыяльнай і культурнай палітыкі на тэрыторыі рэгіёна.

Рэсурсная база сацыяльна-культурнага праектавання і ўмовы яе эфектыўнага спажывання. Рэсурсная падтрымка праекта як умова яго рэалізацыі ў рэгіёнах. Асноўныя віды рэсурсаў сферы культуры, іх асаблівасці і носьбіты. Рэсурсны дэфіцыт як норма праектнага менеджменту.

*Тэма 43. Арганізацыя праектнай дзейнасці і яе тэхналогіі*

Структура праектнай дзейнасці як сістэмы стварэння і рэалізацыі праекта. Паняцце «тэхналогіі сацыяльна-культурнага праектавання». Суадносіны паняццяў «праект», «праектная задума», «місія праекта», «ідэя праекта».

«Праектная мэта» як спосаб інтэграцыі дзеянняў і намаганняў розных суб’ектаў праекта ў вызначанай паслядоўнасці і руху да жаданай сітуацыі. Канцэпцыя праекта. Задачы праекта як канкрэтныя крокі па дасягненні мэты. Сувязь задач з праблемнай сітуацыяй. Вызначэнне сродкаў і метадаў рэалізацыі праекта.

Культурна-адпачынкавыя праграмы, культурныя акцыі, святы і фестывалі як асноўныя формы рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў. Адлюстраванне праектнай ідэі ў канцэпцыі сацыяльна-культурнага праекта. Метад LFA (Logical Framework Approach – лагічны рамачны падыход) – як метад праектнага планавання. Тэхналогія распрацоўкі сацыяльнага праекта ладу жыцця. Сацыяльна-культурнае праектаванне як частка тэхналогіі культурна-забаўляльнай дзейнасці і арт-менеджменту.

Кіраванне праектамі на аснове стандартаў ICB IPMA і НТК СОВНЕТ. Рызыка-менеджмент.

*Тэма 44. Асноўныя этапы распрацоўкі*
*і рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў*

Тэхналогія праектавання як разгорнутая ў вызначанай паслядоўнасці сістэма працэдур. Логіка праектавання. Віды праблемных сітуацый: асобасныя і сацыяльна абумоўленыя. Вызначэнне і характарыстыка аўдыторыі як канкрэтызацыя пра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

блемнай сітуацыі ў форме выяўлення суб'екта сацыяльна-культурнага праекта.

Абгрунтаванне лагічнай паслядоўнасці дзеянняў. Тэхналогія праектавання як разгорнутая ў паслядоўнасці сістэма працэдур і сумесных дзеянняў.

Характарыстыка этапаў: канцэптуальны, кантэкстуальны, тэхналагічны, працэсуальны, адаптыўны, выніковы. Канцэпцыя праекта. «Праектная мэта» як спосаб інтэграцыі дзеянняў і намаганняў розных суб'ектаў праекта. Задачы праекта як канкрэтныя крокі па дасягненні мэты. Вызначэнне сродкаў і метадаў рэалізацыі праекта. Аналіз вынікаў рэалізацыі сацыяльна-культурнага праекта і галоўныя крытэрыі ацэнкі эфектыўнасці праекта.

*Тэма 45. Аўдыторыя праекта*
*як аснова сацыяльна-культурнага праектавання*

Вызначэнне і характарыстыка аўдыторыі як канкрэтызацыя праблемнай сітуацыі ў форме выяўлення суб'екта сацыяльна-культурнага праекта. Сацыяльна-культурны праект як навукова абгрунтаваная мадэль вырашэння сацыяльна-культурнай праблемы.

Аўдыторыя, кантактная і мэтавая група ў сацыяльна-культурным праектаванні. Крытэрыі сегментавання і характарыстыка аўдыторыі праектаў. Сацыяльна арыентаваныя праекты з улікам аўдыторыі. Дабрачынныя праекты для сацыяльна неабароненых груп насельніцтва. Умовы і крытэрыі эфектыўнасці сацыяльных праграм і праектаў.

*Тэма 46. Сацыяльна-культурная сутнасць*
*вольнага часу і культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Вольны час як шматмерны сацыяльны феномен. Культурна-адпачынкавая дзейнасць як сацыяльна-культурны працэс, як сродак далучэння людзей да нацыянальнай і сусветнай культуры. Псіхолага-педагагічная сутнасць, псіхалагічныя механізмы культурна-адпачынкавай дзейнасці. Асаблівасці арганізацыі выхаваўчага працэсу ў аматарскіх калектывах і аб'яднаннях.

Метады стымулявання культурна-адпачынкавай актыўнасці людзей. Метады арганізацыі творчай дзейнасці. Сацыяльная псіхалогія ў арганізацыі масавых форм культурна-адпачынка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вай дзейнасці. Суб’ект-аб’ектная сувязь як умова педагагічнага працэсу ў культурна-адпачынкавай сферы.

Сфера вольнага часу як прастора рэалізацыі прафілактыка-карэкцыйных (анімацыйных, адаптацыйных, рэабілітацыйных) тэхналогій.

### *Тэма 47. Культурна-адпачынкавая дзейнасць як від сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Культурна-адпачынкавая дзейнасць як сродак рэалізацыі сацыяльна-культурнай актыўнасці людзей у сферы вольнага часу, як працэс засваення, стварэння і распаўсюджвання культурных каштоўнасцей у сферы вольнага часу. Грамадска-культурны патэнцыял вольнага часу. Педагагічны патэнцыял культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Аб’ект культурна-адпачынкавай дзейнасці. Прынцыпы культурна-адпачынкавай дзейнасці: непарыўная сувязь з жыццём, дыферэнцыраваны падыход да розных груп насельніцтва, апора на самадзейнасць людзей, прынцып сацыялізацыі, індывідуалізацыі, паслядоўнасці, сістэмнага падыходу, мэтанакіраванасць.

Сацыяльныя функцыі культурна-адпачынкавай дзейнасці: інкультурацыі, сацыялізацыі, культуратворчая, выхаваўчая, інфармацыйна-асветніцкая, адукацыйная, камунікатыўная. Культурна-адпачынкавая дзейнасць як частка эканамічнай вытворчасці і сегмент сацыякультурнага сэрвісу.

Масавыя формы адпачынку і забаў: святы, відовішчы, тэатралізаваныя паказы, кірмашы, шоу-праграмы, фестывалі, абрады, тэматычныя вечары, дыскатэкі. Сэнсавы і эмацыянальны зарад масавых форм арганізацыі вольнага часу.

### *Тэма 48. Сфера вольнага часу як прастора задавальнення культурных інтарэсаў і патрэбнасцей асобы*

Вольны час – неабходны і неад’емны элемент ладу жыцця чалавека. Асэнсаванне вольнага часу ў кантэксце рэалізацыі інтарэсаў асобы, звязаных з рэкрэацыяй, самаразвіццём, самарэалізацыяй, зносінамі, задавальненнем, аздараўленнем і г. д. Вольны час як сфера жыццядзейнасці грамадства, што рэалізуе патрэбы асобы ў арганізаваным адпачынку, гульнявой, творчай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і святочнай дзейнасці, у сумесным вырашэнні сацыяльна-культурных праблем.

Патрэбнасць як «чаканне культурных даброт і паслуг» з боку розных суб'ектаў культурна-дасугавай дзейнасці, з боку сацыяльна-культурных інстытутаў. Асноўныя функцыі вольнага часу: рэкрэацыйная – зняцце фізічнага, псіхічнага, інтэлектуальнага напружання; аднаўленне сіл пасродкам актыўнага адпачынку; развіваючая – уцягванне асобы ў працэс бесперапыннага асветніцтва; развіццё мастацкага, тэхнічнага і іншых відаў аматарскай творчасці; забеспячэнне асобасна значных зносін; рэалізацыя кампенсатарных магчымасцей вольнага баўлення часу, пашырэнне сферы праяўлення асобасных якасцей; самарэалізацыі творчых патэнцый.

Сфера вольнага часу як прастора рэалізацыі прафілактыка-карэкцыйных (анімацыйных, адаптацыйных, рэабілітацыйных) тэхналогій.

Вывучэнне запытаў і інтарэсаў чалавека ў сферы вольнага часу як умова арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Мэты і задачы сацыяльна-ахоўных тэхналогій: сацыяльная рэабілітацыя, пашырэнне круга зносін, развіццё творчага патэнцыялу, самарэалізацыя і самавыяўленне, пашырэнне кругагляду, развіццё камунікатыўных навыкаў, прафілактыка дэзаадаптацыйных форм паводзін.

### *Тэма 49. Сфера вольнага часу як прастора рэалізацыі прафілактыка-карэкцыйных тэхналогій*

Культурна-адпачынкавая дзейнасць як сродак прафілактыкі і карэкцыі негатыўнага эмацыянальнага стану асобы. Культурна-адпачынкавая дзейнасць – умова рэалізацыі сацыяльна-ахоўных, прафілактыка-карэкцыйных (адаптацыйных, анімацыйных, рэабілітацыйных) тэхналогій. Характарыстыка аб'ектаў уздзеяння прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці: дзеці-сіроты, інваліды, дзеці з дэвіянтнымі паводзінамі, ахвяры надзвычайных сітуацый і інш.

Мэты і задачы прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці. Сукупнасць карэкцыйных, прафілактычных, развіваючых, дыдактычных задач у структуры культурна-дасугавых праграм.

Сацыяльна-педагагічныя патрабаванні да распрацоўкі прафілактыка-карэкцыйных культурна-дасугавых праграм.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метады прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці: бібліятэрапія, арт-тэрапія, музыкатэрапія, гульнятэрапія, казкатэрапія, тураатэрапія і інш.

Масавыя, групавыя, індывідуальныя формы і метады арганізацыі прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці.

Псіхолага-педагагічныя патрабаванні да суб'екта прафілактыка-карэкцыйнай дзейнасці: добразычлівасць, эмпатыя, педагагічны такт; псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць і інш.

### *Тэма 50. Дыферэнцыраваны падыход да арганізацыі вольнага часу розных катэгорый насельніцтва*

Улік узроставых, гендарных, сацыяльных, прафесійных, адукацыйных, рэгіянальна-тэрытарыяльных асаблівасцей у арганізацыі вольнага часу розных груп насельніцтва.

Арганізацыя культурна-адпачынкавай дзейнасці дзяцей. Пазакласная і пазашкольная работа як сродак фарміравання асобы дзіцяці. Культурна-адпачынкавая дзейнасць як сродак самарэалізацыі асобы падлетка. Роля педагога ў арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці падлеткаў.

Месца культурна-адпачынкавай дзейнасці ў маладзёжнай культуры. Традыцыйныя і інавацыйныя формы культурна-адпачынкавай дзейнасці моладзі. Вольны час моладзі як сацыяльна-педагагічная праблема.

Асаблівасці вольнага часу людзей сярэдняга ўзросту. Развіццё кірункаў культурна-адпачынкавай дзейнасці людзей сярэдняга ўзросту: мастацка-творчага, спартыўна-аздараўленчага, камунікатыўнага, рэкрэацыйна-забаўляльнага.

Сацыяльна-псіхалагічныя характарыстыкі людзей пажылога ўзросту. Асноўныя кірункі і формы арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці пажылых людзей. Клубы і аматарскія аб'яднанні як найболей папулярная форма арганізацыі вольнага часу пажылых людзей, ветэранаў. Сям'я як аб'ект уздзеяння культурна-адпачынкавых устаноў. Развіццё сямейнай мастацкай творчасці. Асаблівасці арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці гарадскіх і сельскіх сямей.

Прынцыпы арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці розных катэгорый насельніцтва: даступнасць і паслядоўнасць арганізацыйных дзеянняў; адзінства арганізацыі і самаарганізацыі; адзінства арганізацыйных і выхаваўчых дзеянняў. Апора

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на самадзейнасць і ініцыятыву ўдзельнікаў – важнейшы прынцып культурна-дасугавай дзейнасці.

### *Тэма 51. Станаўленне і развіццё культурна-адпачынкавай індустрыі*

Паняцце культурна-адпачынкавай індустрыі. Культуралагічныя і сацыялагічныя тэорыі фарміравання культурна-адпачынкавай індустрыі: канцэпцыя генезісу і развіцця культуры Ё. Хёйзінгі (гульня як асноватворны прынцып чалавечай дзейнасці); тэорыя «культурных індустрый» Т. Адорна і М. Хоркхаймера (крытыка стандартызацыі культурнага жыцця, адрозніванне высокай і масавай культуры, эканоміка вольнага часу); Ж. Бадрыяр і межы сацыяльнай тэорыі (масавае спажыванне як сацыяльны феномен); канцэпцыя «цывілізацыі вольнага часу» Ж. Дзюмазедзье і Ж. Фурасце; Т. Веблен «Тэорыя бяздзейнага класа»; канцэпцыя масавага грамадства Х. Артэгі-і-Гасета.

Культуралагічны падыход да індустрыі вольнага часу, які базіруецца на тэндэнцыі «змешвання» розных культурных форм (змешванне элітарнай і масавай культуры, пазнавальных і забаўляльных форм дзейнасці). Культурная індустрыя і яе ўзаемасувязь з індустрыяй вольнага часу. Тэорыя прыкладной культуралогіі (М. А. Арыярскі і інш.).

Сацыялогія вольнага часу як важная метадалагічная аснова культурна-адпачынкавай індустрыі. Сувязь тэорый сацыяльна-культурнай, культурна-адпачынкавай дзейнасці і культурна-адпачынкавай індустрыі. Уклад сучасных расійскіх і беларускіх даследчыкаў у развіццё тэарэтыка-метадалагічных асноў культурна-адпачынкавай індустрыі.

### *Тэма 52. Умовы станаўлення і развіцця культурна-адпачынкавай індустрыі ў Беларусі*

Сацыяльна-культурныя ўмовы фарміравання і развіцця культурна-адпачынкавай індустрыі: павелічэнне вольнага часу, рост гарадскога насельніцтва, змена культурна-каштоўнасных арыентацый, уплыў тэлебачання і Інтэрнэту і інш. Развіццё нарматыўна-прававой базы, фінансавых і падатковых механізмаў фарміравання і падтрымкі культурна-адпачынкавай індустрыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уплыў эканамічнай і палітычнай сітуацыі на развіццё культурна-адпачынкавай індустрыі і дзейнасць яе суб'ектаў. Узаемасувязь працэсаў глабалізацыі, індустрыялізацыі, інфарматызацыі і развіцця культурна-адпачынкавай індустрыі ў Беларусі. Асноўныя культурна-адпачынкавыя прыярытэты насельніцтва нашай краіны.

Развіццё прадпрымальніцтва ў сферы культуры як аснова развіцця культурна-адпачынкавай індустрыі. Творчы/крэатыўны кластар (creative cluster) – як культурна-прадпрымальніцкае аб'яднанне. Стварэнне заканадаўчай базы, фінансавых і падатковых механізмаў падтрымкі і развіцця творчых індустрый у Беларусі на аснове міжнароднага вопыту.

*Тэма 53. Інфраструктура культурна-адпачынкавай індустрыі ў Рэспубліцы Беларусь*

Паняцце інфраструктуры культурна-адпачынкавай індустрыі, характарыстыкі асноўных структурных адзінак: вытворчы і сэрвісны комплексы; вытворчасць і трансляцыя культурна-адпачынкавай інфармацыі, аўдыя- і відэапрадукцыі; прафесійныя кадры і ўстановы па іх падрыхтоўцы ў Рэспубліцы Беларусь.

Характарыстыкі развіцця асноўных сегментаў культурна-адпачынкавай індустрыі: індустрыя турызму; індустрыя забаў; арт-бізнес (галерэі, выставачныя залы); музычны шоу-бізнес; спартыўна-відовішчная індустрыя; індустрыя моды; гульнявая індустрыя; тэлевізійная індустрыя; радыёіндустрыя. Забаўляльная індустрыя (начныя клубы, дыскатэкі, більярд-клубы, боўлінг-клубы, забаўляльныя паркі. Інтэрнэт-тэхналогіі. Новыя культурна-забаўляльныя ўстановы: антыкафэ, арт-кафэ і г. д. Сродкі масавай інфармацыі і індустрыя вольнага часу і забаў.

Тэхналагічны ланцужок у культурна-адпачынкавай індустрыі: вытворца – культурны прадукт – арт-агент (арт-агенцтвы) – маркетынгавыя тэхналогіі – спажывец.

*Тэма 54. Творчыя індустрыі: агульная характарыстыка і перспектывы развіцця ў Беларусі*

Сутнасць, паняцце і характарыстыкі творчых індустрый. Творчыя індустрыі як інавацыйная тэхналогія развіцця еўрапейскіх гарадоў. Гісторыя станаўлення творчых індустрый у еўрапейскіх і заходніх краінах. Практыка развіцця творчых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

індустрый у розных краінах. Базавыя элементы канцэпцыі развіцця творчых індустрый.

Умовы станаўлення і развіцця творчых індустрый у Беларусі. Творчыя індустрыі як мадэль мадэрнізацыі сферы культуры. Творчыя кластары як інавацыі ў культурна-дасугавай індустрыі. Творчыя/крэатыўныя кластары – паняцце і структура. Творчыя кластары як новы від прадпрымальніцкай актыўнасці ў сферы культуры. Практыка развіцця творчых кластараў у іншых краінах. Змест творчага кластара.

Творчыя прасторы: агульная характарыстыка і віды дзейнасці. Адрозненне творчых кластараў ад творчых прастор. Творчыя кластары і творчыя/крэатыўныя прасторы ў Беларусі.

### *Тэма 55. Тэндэнцыі і перспектывы развіцця індустрыі вольнага часу ў Беларусі*

Індустрыя вольнага часу як сродак інавацый у сферы культуры і мастацтва. Сувязь і ўзаемапранікненне індустрыі вольнага часу і індустрыі культуры.

Тэндэнцыі і перспектывы развіцця культурна-дасугавай індустрыі: уплыў з боку шоу-бізнесу і глабалізацыйных працэсаў, камп'ютарызацыя, тэхнізацыя, інтэрнэт-камунікацыі, функцыянаванне шматфункцыянальных культурна-дасугавых цэнтраў, развіццё творчых індустрый і творчых кластараў, выкарыстанне інавацыйных праектаў у дзейнасці ўстаноў індустрыі вольнага часу і г. д.

Пашырэнне аб'ёму платных паслуг насельніцтву на базе дзяржаўных устаноў культуры, дасуга і мастацтва.

### *Тэма 56. Тэхналогіі арт-менеджменту ў індустрыі вольнага часу*

Утрыманне і спецыфіка арт-менеджменту ў індустрыі вольнага часу. Арт-рынак як сістэма таварнага звароту твораў мастацтва. Агульная структура тэхналогіі арт-менеджменту: сацыяльны заказ, мэта, суб'ект, аб'ект, утрыманне, формы, метады, сродкі, матэрыяльна-тэхнічная база, фінансавае забеспячэнне, прававое забеспячэнне, рэкламна-інфармацыйнае і кадравае забеспячэнне.

Рэкрэацыйна-забаўляльныя тэхналогіі. Тэхналогіі пазнавальна-адукацыйнай дзейнасці. Тэхналогіі арганізацыі творчай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці. Тэхналогіі арганізацыі камунікатыўнай дзейнасці. Святочна-відовішчныя тэхналогіі.

Менеджмент як ключавое звяно ў развіцці індустрыі культуры і вольнага часу. Індустрыя вольнага часу як прастора прафесійнай дзейнасці менеджараў сацыяльна-культурнай сферы.

Асноўныя функцыі арт-менеджара ў індустрыі вольнага часу (мастацка-творчая, праектна-тэхналагічная, арганізацыйна-кіраўнічая, маркетынгавая функцыя, якая ўключае PR і рэкламу, фінансава-эканамічная, юрыдычна-прававая функцыя).

### *Тэма 57. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Паняцце і сутнасць метадычнага кіраўніцтва і навукова-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці. Сістэма навукова-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Беларусі. Структура і функцыі дзяржаўных і ведамасных метадычных устаноў. Функцыі абласных цэнтраў народнай творчасці і раённых арганізацыйна-метадычных цэнтраў культурна-асветніцкай дзейнасці.

Механізмы ўкаранення ў практыку сучасных тэхналогій арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці і развіцця народнай творчасці, павышэння прафесійнага майстэрства работнікаў культуры. Шляхі ўдасканалення практыкі рэгулявання культурнымі працэсамі, пошуку найбольш мэтазгодных форм і метадаў арганізацыі вольнага часу розных груп насельніцтва.

Змест, характарыстыка і віды метадычных матэрыялаў. Методыка аналізу і абагульнення практыкі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Нарматыўна-прававая інфармацыя і яе роля ў арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Навуковая інфармацыя як аснова сацыякультурных практык, якаснасці, мэтазгоднасці і эфектыўнасці арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Інавацыйныя тэхналогіі інфармацыйна-метадычнага забеспячэння сацыяльна-культурнай дзейнасці.

### *Тэма 58. Прыкладная культуралогія як навукова-метадычная база сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Навукова-метадычнае забеспячэнне культурна-асветніцкай і культуратворчай дзейнасці ўстаноў культуры і адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі, спартыўна-аздараўленчых, сана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

торна-курортных, камерцыйна-забаўляльных і іншых інстытутаў сацыяльна-культурнай сферы як адна з асноўных функцый прыкладной культуралогіі. Фарміраванне культурнага асяроддзя асобы як навукова-метадычная функцыя прыкладной культуралогіі.

Прыкладная культуралогія як прастора навукова-метадычнай дзейнасці, якая забяспечвае распрацоўку і ўкараненне тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці; ажыццяўленне дзяржаўнай культурнай палітыкі і прыняцце навукова абгрунтаваных кіраўніцкіх рашэнняў у сацыяльна-культурнай сферы; эфектыўнае прагназаванне, праектаванне і рэгуляванне сацыяльна-культурных працэсаў; распрацоўку методыкі захавання помнікаў гісторыі і культуры, нацыянальна-культурных традыцый; перадачу і пашыранае ўзнаўленне сацыяльна-культурнага вопыту; абгрунтаванне тэхналогіі дасягнення адпаведнага культурным нарматывам узроўню сацыяльнай практыкі.

*Тэма 59. Рэсурснае забеспячэнне*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Рэсурсы як сродкі аптымізацыі сацыякультурнай сітуацыі ў працэсе рэалізацыі праекта. Кіраванне рэсурсамі як адна з галоўных падсістэм кіравання праектам. Кіраванне рэсурсамі як забеспячэнне іх аптымальнага выкарыстання для дасягнення канчатковай мэты кіравання праектам – фарміравання выніку праекта ў адпаведнасці з запланаванымі паказчыкамі.

Рэсурснае забеспячэнне як працэс, накіраваны на дасягненне мэты сацыяльна-культурнага праекта з дапамогай упарадкавання зыходных рэсурсаў (нарматыўных, фінансавых, кадравых, інфармацыйных і інш.) у запатрабаваныя вынікі (культурныя прадукты ці паслугі).

Нарматыўна-прававы рэсурс як сукупнасць дзеючых нарматыўных і прававых дакументаў на аснове санкцыянаваных дзеянняў. Фінансава-эканамічны рэсурс: бюджэтныя (рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты) і пазабюджэтныя сродкі (дабрачынная фонды; сродкі некамерцыйных і камерцыйных арганізацый; спонсары і мецэнаты).

Кадравы рэсурс: прафесійная кампетэнтнасць удзельнікаў сацыяльна-культурнага праекта. Інтэлектуальны рэсурс праекта: актыўны патэнцыял аўтараў, генерацыя інавацыйных ідэй.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйна-метадычны рэсурс рэалізацыі сацыяльна-культурнага праекта.

Рэсурсны патэнцыял тэатральна-відовішчных арганізацый. Рэсурсны патэнцыял культурна-асветніцкіх арганізацый. Ажыццяўленне сацыяльна-культурнай дзейнасці з прыцягненнем рэсурсаў вытворчага ўздзеяння і рэсурсаў духоўнага ўспрымання для дасягнення пастаўленых мэт і задач, атрымання пэўных рэзультатаў.

Сацыяльна-дэмаграфічны рэсурс. Вывучэнне запытаў і інтарэсаў чалавека ў сферы вольнага часу як умова арганізацыі культурна-адпачынкавай дзейнасці (пазнавальныя, дзейныя) асобы, сацыяльных груп і грамадства ў цэлым. Прыродныя і энергетычныя рэсурсы, арганізацыйна-кіраўнічы і інфармацыйна-творчы рэсурсы. Рэклама як адзін з кампанентаў рэсурснай базы.

### *Тэма 60. Культуролаг-менеджар як суб'ект арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці*

Сацыякультурная сфера як аб'ект рэалізацыі патэнцыялу прыкладной культуралогіі. Сацыяльна-культурная дзейнасць як сфера прафесійнай дзейнасці па стварэнні прадукту, здольнага фарміраваць і задавальняць культурныя патрэбы людзей з выкарыстаннем вобразна-сімвалічных сродкаў і творчага ўяўлення ў адпаведных відах мастацтва і культуры. Стварэнне культурнага асяроддзя, прыцягненне людзей у працэс бесперапыннай адукацыі, сацыяльна-культурную творчасць і рэкрэацыйна-забаўляльны вольны час як прафесійная мэта дзейнасці культуролага-менеджара.

Кампетэнтнасная мадэль культуролага-менеджара. Паказчыкі прафесійнай кампетэнтнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці. Узаемасувязь ведаў і дзейнасці спецыяліста. Віды ведаў, якія вызначаюць кампетэнтнасць спецыяліста.

Напрамкі прафесійнай дзейнасці культуролага-менеджара. Культуролаг-менеджар як тэарэтык, метадыст і арганізатар сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Функцыі культуролага-менеджара як суб'екта арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: культураахоўная, культуратворчая, сацыяльна-арганізацыйная, сацыяльна-педагагічная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Афіцыйнае выданне. – Мінск : Беларусь, 2009. – 95 с.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З).

Гражданский кодекс Республики Беларусь: по состоянию на 3 ноября 2006 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2006. – 656 с.

Аб дзяржаўных мінімальных стандартах : Закон Рэспублікі Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 1999. – № 89. – С. 24–27.

*Аванесова, Г. А.* Культурно-досуговая деятельность: Теория и практика организации / Г. А. Аванесова. – М. : Аспект Пресс, 2006. – 236 с.

*Ариарский, М. А.* Прикладная культурология / М. А. Ариарский. – СПб. : ЭГО, 2001. – 287 с.

Арт-менеджмент как вид управленческой деятельности : сб. ст. – Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; под ред. С. Б. Мойсейчук, А. И. Степанцова. – Минск : БГУКИ, 2012. – 155 с.

*Бабосов, Е. М.* Социология управления : учеб. пособие / Е. М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2002. – 288 с.

*Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 215 с.

*Ерасов, Б. С.* Социальные институты культуры и управление культурой / Б. С. Ерасов // Социальная культурология : учебник для студентов высш. учеб. заведений / Б. С. Ерасов. – М. : Аспект Пресс, 2000. – С. 158–172.

*Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду : вучэб.-метад. дапам. / А. Я. Камінскі. – Мінск : [б.в.], 1991. – 118, [1] с. : іл.

*Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Любительское художественное творчество // Современная Беларусь : энцикл. справ. Том 3. Культура и искусство. – Минск : Белорус. наука, 2007. – С. 683–729.

*Макарова, Е. А.* О научном статусе теории социально-культурной деятельности / Е. А. Макарова // Весн. Ин-та культуры Беларуси, 2012. – С. 35–42.

*Макарова, Е.А.* Теория социально-культурной деятельности как область научного знания / Е. А. Макарова // Культура. Наука. Творчество: материалы VI Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, БГУКИ, май 2012 г.). – С. 299–304.

*Макарова, Е. А.* Миссия теории социально-культурной деятельности как области научного знания / Е. А. Макарова // Асоба ў кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў : матэрыялы I Міжнар. навук. канф. памяці Ядвігі Дамінікаўны Грыгаровіч (12 лістап. 2014 г., г. Мінск) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2015. – С. 31–38.

*Мойсейчук, С. Б.* Режиссура культурно-досуговых программ : учеб.-метод. пособие для студентов вузов по направлению специальности 1-21 04 01-02 Культурология (прикладная) / С. Б. Мойсейчук. – Минск : [б.и.], 2011. – 98 с. : схемы.

*Смаргович, И. Л.* Основы культурно-досуговой деятельности : учеб.-метод. пособие для студентов вузов по направлению специальности 1-21 04 01-02 Культурология (прикладная) / И. Л. Смаргович. – Минск : БГУКИ, 2013. – 172 с.

*Стрельцов, Ю. А.* Культурология досуга : учеб. пособие / Ю. А. Стрельцов. – Изд. 2-е. – М. : МГУКИ, 2003. – С. 23–37.

*Дадатковая*

Палажэнне аб клубнай установе ў Рэспубліцы Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 2004. – № 180. – С. 97–101.

Палажэнне аб парку культуры і адпачынку ў Рэспубліцы Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 2004. – № 180. – С. 105–107.

Палажэнне аб раённым (гарадскім) метадычным цэнтры народнай творчасці (культурна-асветніцкай работы) // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 2004. – № 180. – С. 101–104.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Положение о театрально-зрелищной организации Республики Беларусь // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь, 2005. – № 3. – С. 131–134.

*Беляцкий, Н. П.* Управление персоналом : учеб. пособие / Н. П. Беляцкий, С. Е. Велесько, П. Ройш. – Минск : Книжный Дом : Экоперспектива, 2005. – 352 с.

*Боганева, А. М.* Новыя тыпы ўстаноў культуры і клубных фарміраванняў у галіне традыцыйнай культуры / А. М. Боганева, В. А. Лабачэўская // Весн. БелІПК : навук.-метад. зб. – Мінск : БелІПК, 1999. – С. 88–103.

*Ігнатовіч, П. Р.* Аб'ектыўная абумоўленасць рэгулявання сферай культуры / П. Р. Ігнатовіч // Чалавек. Культура. Рынак : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 10–11 крас. 2000 г., г. Мінск. – Мінск : БелІПК, 2000. – С. 76–79.

*Смаргович, И. Л.* Инновационные формы досуговой деятельности современной молодежи в Беларуси / И. Л. Смаргович // Павышэнне ролі клубных устаноў у сацыякультурным жыцці рэгіёнаў : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф. (22–23 лістап. 2006 г., г. Мінск). – Мінск : БелДІПК, 2006. –168 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРЫКЛАДНАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ**

*Праграма дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-02 Культуралогія (прыкладная)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая


Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 1/16.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,85. Ул.-выд. арк. 2,20. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ